*А.В.ПАГОЦКАЯ*

# СЦЭНАГРАФІЯ ЯК ПРАДМЕТ НАВУКОВАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

*Артыкул прысвечаны вывучэнню феномена сцэнаграфіі як прадмета навуковага даследавання. Шматзначнасць тэрміна “сцэнаграфія” актуалізуе вывучэнне гэтай праблемы з боку тэарэтыкаў і гісторыкаў тэатральнага і выяўленчага мастацтва. У артыкуле разглядаюцца асноўныя канцэпцыі вывучэння сцэнаграфіі, якія склаліся гістарычна.*

Мастацтва сцэнаграфіі доўгі час амаль не вывучалася. Тэатральныя архітэктары і мастакі маглі лічыцца самастойнымі творцамі, значнасць прасторавага вырашэння спектакля, тэатральнай дэкарацыі як неад’емнай часткі сінтэтычнага мастацтва тэатра прызнавалася ўсімі. Імёны мастакоў тэатра займаюць ганаровае месца побач з вядомымі рэжысёрамі і ў тэатральнай праграме, і ў даследаваннях мастацтвазнаўцаў, і ў кнігах, прысвечаных розным перыядам у развіцці сцэнічнага мастацтва. Значэнне візуальнага вобраза спектакля значна расце, аб чым сведчаць і тэатральная практыка, і тэарэтычныя канцэпцыі драматургаў і рэжысёраў.

Першыя спробы тэарэтычна асэнсаваць тэатральныя працэсы на тэрыторыі Беларусі былі зроблены ў XVII–XVIII стст. Так, у першай палове XVII ст. Мацей Казімір Сарбеўскі (1595–1640) у трактаце “Пра трагедыю і камедыю, або Сенэка і Тэрэнцый” (створаным на аснове яго курса лекцый у Полацкім езуіцкім калегіуме) тэарэтычна абгрунтаваў паэтыку школьнага тэатра, даў практычныя парады да пастановак і дадаў спецыяльныя малюнкі, чарцяжы сцэнічнага абсталявання [11].

У XVIII–XIX стст. тэатры арыентаваліся на трактат Ф.Ланга “Разважанні аб сцэнічнай ігры” (1727) і працы прафесара Полацкай езуіцкай калегіі Г.Грубера [8, с. 146]. Фелікс Ланг гаварыў пра роўнасць рэжысёра-пастаноўшчыка і мастака-дэкаратара, а таксама апісваў афармленне, светлавыя эфекты і тэхніку школьнай і прыдворнай сцэны тэатра барока. Габрыэль Грубер выкладаў у калегіі архітэктуру і механіку (1784–1799) і пабудаваў у ёй тэатральную залу з багатымі дэкарацыямі (1784).

Адным з першых буйных даследаванняў па гісторыі прыдворнага тэатра на тэрыторыі Беларусі стала кніга А.Мілера “Польскі тэатр і музыка ў Літве” [15]. Аўтар разглядае дзейнасць вядомых беларускіх тэатралаў – М.Радзівіла, М.К.Агінскага, А.Тызенгаўза, А.Сапегі – і адзначае, што адно з першых месцаў сярод іх займае тэатр Францішкі Уршулі Радзівіл [15, с. 33].

Падрабязная характарыстыка дэкарацыйнай тэхнікі, сцэнічных пабудоў і прыстасаванняў даецца ў мастацтвазнаўчым артыкуле Г.Барышава “Маёнткавыя прыгонныя тэатры”, змешчаным у першым томе “Гісторыі беларускага тэатра” [8, с. 177–224]. Адно з самых буйных даследаванняў тэатра на тэрыторыі Беларусі – кніга Г.Барышава “Тэатральная культура Беларусі XVIII ст.” [2]. Даследчык падрабязна апісвае асноўныя праявы тэатральнага мастацтва на Беларусі ў XVIII ст. У кнізе ўважліва прасочваюцца шляхі развіцця розных тыпаў і формаў школьнага, прыдворнага прыватнаўласніцкага і буржуазна-камерцыйнага тэатраў, а таксама народнай тэатральнай творчасці, дэкарацыйнага мастацтва і тэатральнага дойлідства, якія атрымалі развіццё на тэрыторыі Беларусі ў XVIII ст. Вельмі важнымі для нашага даследавання з’яўляюцца апісанне і аналіз тэатральнай архітэктуры і сцэнаграфіі.

Сцэнаграфія станавілася аб’ектам пільнай увагі тэатразнаўцаў, гісторыкаў, фалькларыстаў і этнографаў. Працы, прысвечаныя рускаму і савецкаму перыядам тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва, належаць Дж.Боулту [5], Е.М.Косцінай і Ф.Я.Сыркінай [12]. Развіццё еўрапейскай тэатральнай сцэнаграфіі даследавана ў работах В.І.Бярозкіна [3; 4], М.Громава [9]. Спецыфіку сцэнаграфіі опернага спектакля разглядалі А.Апіа, В.Ванслаў [7].

У другой палове XX – пачатку XXI ст. мастацтвазнаўцы пачалі вывучаць асобныя галіны тэатральнага мастацтва – архітэктуру тэатральных будынкаў, тэхніку сцэны і інш. З’яўляюцца асобныя артыкулы, кнігі, якія ўзнімаюць пытанні генезісу і эвалюцыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сцэнаграфіі. Гэта тэарэтычныя працы і лекцыі Ё.Свободы [3], даследаванні В.Бярозкіна [3; 4], В.Шапавалава [13; 14].

Менш вывучаны тэарэтычныя пытанні сцэнаграфіі. Узаемасувязь сцэнаграфіі і тэатральнай архітэктуры разгледжана ў работах В.Быкава [6]. Праблемы ўплыву на спектакль тэхнічных магчымасцей сцэны вывучаліся В.Базанавым [1], тэорыя прасторавага вырашэння драматычнага спектакля распрацавана ў работах М.Громава [9] і г.д.

Мэтай гэтага артыкула з’яўляецца вызначэнне зместу паняцця “сцэнаграфія”, разгляд асноўных канцэпцый вывучэння сцэнаграфіі.

Сцэнаграфія вызначаецца як адзін з ключавых момантаў тэатральнай дзеі – прасторавае вырашэнне спектакля. Французскі даследчык і тэатразнаўца П.Паві ў “Слоўніку тэатра” называе сцэнаграфію “вынікам семіялагічнай канцэпцыі пастаноўкі” [10, с. 338], а таксама ў шэрагу паняццяў называе сінонімы, якія ўжываюцца ў шматлікіх даследаваннях тэарэтыкаў і гісторыкаў тэатральнай культуры: “дэкарацыя”, “вобразнасць”, “будова сцэны”, “іграваяя прастора”, “прастора сцэнічнага аб’екта” і інш. [10, с. 68]. На наш погляд, сцэнаграфія – больш шырокае паняцце, якое ўключае ў сябе ўсё тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва, сукупнасць элементаў прасторавага вырашэння спектакля.

Сцэнаграфія становіцца мастацтвам афармлення спектакляў пры неабходных умовах. Гэта адбываецца ў той момант, калі з сінкрэтызму выдзяляецца мастацкая дзейнасць і ўзнікае мастацтва, у дадзеным выпадку – мастацтва тэатра (якое пры гэтым, у сваю чаргу, само застаецца сінкрэтычным па сваёй структуры яшчэ доўгі час – да эпохі Адраджэння). Ужо ўдзельнікі рытуальна-абрадавых дзей падзяляюцца на выканаўцаў і на гледачоў. Самі дзеі перастаюць уваходзіць у склад рытуальна-абрадавых формаў жыцця (хаця і не губляюць сувязі з імі), а становяцца творамі мастацтва – відовішчам, на якое глядзяць і якое ўспрымаюць перш за ўсё эстэтычна.

Мастацтва ўступае ў тэатры ў складаныя ўзаемаадносіны з тэхнікай. Тэатральная тэхніка з’яўляецца адным з важных момантаў сцэнаграфіі, вызначае яе тэхнічныя сродкі і іх дынаміку ў працэсе сцэнічнага прадстаўлення. Гісторыя тэатральнай тэхнікі прасочвае аснашчанасць тэатра тэхнікай і формы яе выкарыстання ў залежнасці ад змяненняў, якія адбываюцца ў тэатральным мастацтве, і ў прыватнасці сцэнаграфіі, увогуле ад тэхнічнага прагрэсу.

Як паказвае гісторыя развіцця тэатральнай тэхнікі, па сутнасці, усе яе віды выкарыстоўваліся тэатрам са старажытных часоў. У пачатку XX ст. многія тэатры ўжо атрымалі амаль ўсе вядомыя зараз віды механічнага абсталявання. І да гэтага часу тэатр актыўна іх выкарыстоўвае. Вядома толькі, што гэта абсталяванне па сваіх тэхнічных параметрах становіцца ўсё больш дасканалым. Адзначым, што неабавязкова тэхнічная аснашчанасць аўтаматычна павышае якасць спектакля. Больш таго, гісторыя паказвае, што многія выдатныя тэатральныя творы мелі недастаткова добра абсталяваныя і нават зусім неабсталяваныя сцэны.

Сцэнаграфія спектакля задаецца архітэктурай тэатральнага будынка, асаблівасцямі ўзаемазвязанасці прасторы сцэны і глядзельнай залы, таму без вывучэння тэорыі архітэктуры немагчыма зразумець многія важнейшыя праблемы прасторавага вырашэння сцэнічнага твора. Гісторыя тэатральнай архітэктуры важная для станаўлення сцэнаграфіі, у ёй прасочваецца ўзаемасувязь тэатральнай архітэктуры з дойлідствам увогуле, з аднаго боку, і, з другога – з эвалюцыяй тэатральнага мастацтва.

Работа мастака ў тэатры над спектаклем пачынаецца адначасова з работай рэжысёра, дырыжора і балетмайстра (у музычным тэатры). Тэрмін “сцэнограф” можа датычыцца творчых работнікаў, занятых у арганізацыі сцэнічнай прасторы (тэатральны мастак, тэатральны тэхнолаг, тэатральны архітэктар, канструктар і інжынер). Тэатральны мастак стварае прасторавае асяроддзе спектакля, якое сумесна з іншымі кампанентамі з’яўляецца неад’емнай часткай мастацкай цэласнасці спектакля. Гэта патрабуе ад мастака-пастаноўшчыка, мастака-тэхнолага, мастака па касцюму і інш., нароўні са спецыялізацыяй, накіраванасці на адлюстраванне мастацкай ідэі спектакля. Станаўленне тэатральнага мастака, яго ролю ў стварэнні спектакля можна прасачыць у гісторыі тэатра. Сцвярджэнне прафесіі мастака тэатра адбывалася ў шэрагу іншых тэатральных прафесій і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

было абумоўлена вырашэннем праблемы мастацкай цэласнасці, візуальнай вызначанасці спектакля.

Задачы тэатральнага мастака мяняліся разам з эвалюцыяй тэатра. Мастак класіцызму, напрыклад, "замыкаў" прастору сцэны "пісанымі завесамі", ствараючы фон для ігры акцёраў. Тут уся нагрузка спектакля ўскладалася на акцёра. Мастак натуралістычнага тэатра "абжываў" прастору, ствараў магчымасці для ўзаемадзеяння акцёраў з асобнымі дэталямі дэкарацый – "як у жыцці". Мастакі пачатку ХХ ст., і асабліва мастакі сімвалічнага тэатра, арыентуючыся на жывапіс, выяўлялі візуальную значнасць тэатральнага вобраза, прастора сцэны атрымала светлавую і колеравую завершанасць. Пачаткам падыходу да візуальнай значнасці спектакля з улікам тэатральнай спецыфічнасці стала дзейнасць Маскоўскага Мастацкага тэатра, работы Я.Вахтангава, эксперыменты Ус.Меерхольда ў Расіі, А.Апіа і Г.Крэга на Захадзе. Пошукі новых рашэнняў у сцэнаграфіі ажыццяўляліся Ус.Меерхольдам, А.Таіравым, Я.Вахтангавым, М.Рэйнхардтам, Э.Піскатарам, Б.Брэхтам. Іх сцэнаграфія мела знакавы характар (у спалучэнні з дынамічнасцю), у ёй захоўвалася функцыянальная залежнасць рэчаў ад ігры акцёра. Зыходзячы з трохмернасці постаці акцёра ў вырашэнні сцэнічнай прасторы, А. Апіа зрабіў фігуру выканаўцы адзінкай маштабных суадносін. Гладкі планшэт сцэны прыстасоўваўся да мізансцэніравання. Працягваючы пошукі А.Апіа, Г.Крэг займаўся пытаннямі сцэнаграфічнай дынамікі пластычных формаў у сінтэзе з музыкай і архітэктурай. Падобныя тэндэнцыі намеціліся ў сусветным драматычным тэатры ў пачатку ХХ ст. з распаўсюджваннем сцэнаграфіі.

Асобныя межы зместу паняцця "сцэнаграфія", якія склаліся ў кантэксце развіцця тэорыі і гісторыі мастацтва, можна правесці наступным чынам.

1. *Сцэнаграфія як сінонім дэкарацыйнага мастацтва* – адзін з самых распаўсюджаных прыкладаў трактоўкі гэтага паняцця. Тэрмін "скенаграфія" сустракаецца яшчэ ў Вітрувія і азначае роспіс сцэны – прымяненне жывапісных перспектыў у афармленні спектакля: "Скенаграфія ёсць малюнак фасада і карціна знешняга выгляду будучага будынка, зробленага з патрэбным захаваннем прапорцый" [13]. Гісторык мастацтва Г.Лукомскі, напрыклад, лічыць, што сцэнаграфія – гэта жывапіснае аздабленне сцэны, у той час як "архітэктаграфія" абазначае архітэктурныя і планіровачныя магчымасці сцэны [14].

Тэрмін "тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва" ўжываецца традыцыйна, у той час як тэрмін "сцэнаграфія" прымяняецца з другой паловы ХХ ст. (што звязана з публікацыямі аб Пражскіх квадрыенале, якія пачалі праводзіцца з 1967 г.). Часам іх адрозніваюць як "два мастацтвы тэатра", якія маюць "розныя сродкі рэалізацыі" (М.А.Фрэнкель). Часцей яны ўжываюцца як сінонімы (у працах В.Ванслава [7], Ф.Сыркінай [12] і інш.).

Як адзначае В.Ванслаў, тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва – гэта асаблівая галіна мастацкай дзейнасці, якая ў роўнай ступені належыць да выяўленчага мастацтва і тэатра. Яно – адзін з кампанентаў, адзін бок сінтэтычнага мастацтва тэатра, дзе работа мастака падпарадкавана спектаклю. Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва мае доўгую гісторыю, якая супадае з гісторыяй як тэатра, так і выяўленчага мастацтва [12, с. 6]. У рабоце "Опера і яе сцэнічнае ўвасабленне" В.Ванслаў сцвярджае, што сцэнічнае ўвасабленне ў тэатры патрабуе ўдзелу выяўленчага мастацтва, якое спалучаецца з драмай, музыкай, сцэнічным дзеяннем, такім чынам дапаўняючы і ўзмацняючы мастацкую цэласнасць. Выяўленчае мастацтва ў тэатры – з'ява складаная. Усе віды прасторава-пластычных мастацтваў могуць уваходзіць у сцэнічнае дзеянне спектакля: у афармленні ўдзельнічаюць мастацтва архітэктуры (у будове і планіроўцы дэкарацый), скульптуры (у дэкарацыях і бутафорыі), дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (у бутафорыі і рэквізіце). Элементы гэтых мастацтваў В.Ванслаў уключае ў адзінае выяўленчае цэлае [7, с. 207].

Мы далучаемся да поглядаў на сцэнаграфію і тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва як не тоесныя з'явы. Сцэнаграфія – больш шырокае паняцце, у той час як тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва з'яўляецца вынікам дзейнасці мастака і мастака-тэхнолага ў спектаклі.

Дэкарацыйнае мастацтва ў тэатры з'яўляецца адной з састаўных частак сцэнаграфіі. Гісторыя дэкарацыйнага мастацтва адлюстроўвае ўплыў на сцэнаграфію выяўленчых, прасторавых відаў творчасці, вызначае гістарычныя формы гэтага ўплыву, лінію іх развіцця ў залежнасці ад генезісу тэатра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва – сістэма мастацка-сюжэтнага афармлення, дамінантная функцыя якога ў спектаклі заключана ў стварэнні вобраза месца дзеяння. Дэкарацыі – самастойныя выразныя сродкі спектакля, здольныя дапамагаць раскрываць самыя розныя сюжэты на тэмы прыроды, архітэктурнага ці бытавога асяроддзя, пра якое распавядае драматургія. Яны ўвасабляюць выяўленчую характарыстыку, якая ўваходзіць у агульную тэму спектакля па сваіх законах. Галоўнай задачай мастака ў спектаклі з'яўляецца афармленне сцэнічнага дзеяння шляхам выяўленча-пластычнага раскрыцця яго істотнага зместу, матываў, абставін драматычнага канфлікту, унутранага стану, перажыванняў героя і інш.

Само паходжанне слова "дэкарацыя" (познелац. decoratio – упрыгожанне) указвае на семантычную сувязь з жывапісам, арнаментам, аздабленнем. У той жа час сцэнаграфія вызначае візуальныя параметры тэатральнага вобраза: дэкарацыі, тэатральны касцюм, грым, рэквізіт, асвятленне, пастановачную тэхніку, архітэктурную зададзенасць тэатра, пластычныя магчымасці акцёрскага складу і інш.

Дэкарацыя ўзнаўляе вобразную характарыстыку гістарычных абставін, умовы і атмасферу спектакля – асяроддзя, у якім дзейнічае акцёр. Яна ствараецца з дапамогай архітэктуры, жывапісу, графікі, мастацкай планіроўкі месца дзеяння, спецыяльных фактур і эфектаў, асвятлення і тэхнікі.

2. *Сцэнаграфія – гэта пэўны этап мастацкага афармлення спектакля.* Даследчыкі гэтым тэрмінам абазначаюць этапы мастацкага афармлення спектакля, якія склаліся гістарычна.

Найбольш паслядоўна такі змест паняцця "сцэнаграфія" адлюстраваны ў даследаваннях мастацтвазнаўцы, даследчыка тэатра В.Бярозкіна. Ён распаўсюджвае тэрмін "сцэнаграфія" на ўвесь аб'ём мастацтва афармлення сцэны (дэкарацыі, касцюмы, святло, пастановачная тэхніка і інш.) і на ўсе перыяды існавання тэатра, вылучаючы ў гісторыі тэатра шэраг этапаў эвалюцыі мастацкага афармлення. В.Бярозкін прапануе сваю сістэматызацыю сцэнаграфіі. Ён выдзяляе наступныя мадэлі сцэнаграфіі: антычная, усходняя, еўрапейская – і тры асноўныя функцыі сцэнаграфіі: ігравая, функцыя абазначэння месца дзеяння і дзейная, ці "персанажная", функцыя. У адпаведнасці з дамінаваннем той ці іншай функцыі ўсю гісторыю развіцця тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва аўтар храналагічна падзяляе на тры перыяды: ігравая сцэнаграфія (ад вытокаў да XVI ст.), дэкарацыйнае мастацтва (з XVI да пачатку XX ст.) і дзейная сцэнаграфія (ад пачатку XX ст. да нашых дзён) [4, с. 13]. Найбольш разгорнута гэта думка выказана ў кнізе "Тэатр Ёзэфа Свобады". Аўтар выдзяляе шэраг этапаў развіцця дэкарацыйнага афармлення тэатральнага твора, і ўласна сцэнаграфіяй ён называе толькі апошні – XX ст. "Сцэнаграфія сцвярджала сябе як мастацтва функцыянальнае, падпарадкаванае агульным законам складанага сінтэтычнага твора-спектакля і разлічанае на цеснае ўзаемадзеянне з акцёрам, драматычным тэкстам, музыкай. Праз гэту ўзгодненасць дзеянняў і раскрываюцца вобразы спектакля" [3, с. 9–11].

Такім чынам, сцэнаграфія, а тым больш сучасная, ужо не можа разглядацца толькі як мастацтва жывапісу, што традыцыйна суадносілася з тэрмінам "тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва". Сцэнаграфія стварае жывапісна-пластычны вобраз у прасторы і ў часе спектакля шляхам трансфармацыі асяроддзя.

3. *Сцэнаграфія – навука аб мастацка-тэхнічных сродках стварэння прасторавай вобразнасці спектакля.* Гэта навука, якая комплексна вывучае сукупнасць усіх тэхнічных і мастацкіх сродкаў афармлення спектакля. Такой думкі прытрымліваюцца В.Базанаў і В.Быкаў. "Сцэнаграфія – гэта сукупнасць усіх тэхнічных і мастацкіх сродкаў пастаноўкі спектакля" [6].

Такім чынам, сцэнаграфія ўяўляе сукупнасць сродкаў прасторавага вырашэння спектакля, якая вызначае візуальную значнасць тэатральнага вобраза. Яна ўключае як асобныя састаўныя часткі дэкарацыйнае мастацтва, архітэктурна-тэхнічныя магчымасці сцэны і пластычныя магчымасці акцёрскага складу [13]. Некаторыя даследчыкі (напрыклад, В.Базанаў, Ё.Свобада) лічаць, што ўласна сцэнаграфія характэрна для тэатра XX ст., менавіта рэжысёрскага тэатра, з-за таго, што сцэнаграфія фарміравалася ў большай ступені рэжысёрамі, а ў сваю чаргу мастакі становяцца мастакамі-сцэнографамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У заключэнне адзначым: аналіз асноўных канцэпцый вывучэння сцэнаграфіі дазваляе сцвярджаць, што мастацтва сцэнаграфіі, якім яно сфарміравалася ў выніку доўгай гістарычнай эвалюцыі, якім мы яго ведаем і разумеем сёння, ахоплівае ўсю матэрыяльна-рэчыўную частку зрокавага вобраза спектакля.

Па-першае, сцэнаграфія ў тэатры – гэта ўся сукупнасць сродкаў прасторавага вырашэння спектакля, якая вызначае візуальную значнасць тэатральнага вобраза і ўключае ўсе асобныя грані тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва і архітэктурна-тэхнічныя магчымасці сцэны.

Па-другое, сцэнаграфія – гэта навука аб мастацка-тэхнічных сродках у стварэнні прасторавай вобразнасці спектакля. Яна вывучае і адлюстроўвае ўплыў на тэатральнае мастацтва выяўленчых, прасторавых відаў творчасці, вызначае гістарычныя формы гэтага ўплыву, лінію іх развіцця ў залежнасці ад генезісу тэатра.

1. *Базанов, В.В.* Театральные здания и сооружения: структура и технология / В.В.Базанов. – СПб.: СПбГАТИ, 2007. – 104 с.

2. *Барышев, Г.И.* Театральная культура Белоруссии XVIII века / Г.И.Барышев; Союз театр. деятелей Респ. Беларусь. – Мн.: Навука і тэхніка, 1992. – 293 с.: ил.

3. *Березкин, В.* Театр Йозефа Свободы / В.Березкин. – М.: Изобр. искусство, 1973. – 199 с.

4. *Березкин, В.И.* Искусство сценографии (от истоков до начала XX века): автореф. дис. … д-ра искусствоведения: 17.00.01 / В.И.Березкин; ВНИИ искусствознания. – М., 1987. – 59 с.

5. *Боулт, Дж. Э.* Русское театрально-декорационное искусство 1880–1930 гг. / Дж.Э.Боулт // Gogol.ru [Электронный ресурс]. – 2007. – Режим доступа: http://old.gogol.ru/enciklopediya-russkoi-kultury/teatr/hudozhniki-russkogo-teatra-1880-1930gg/dzhon-e-boult-russkoe-teatralno-dekoracionnoe-iskusstvo-1880-930/. – Дата доступа: 19.01.2008.

6. *Быков, В.Е.* Проблемы театральной архитектуры и сценографии: автореф. дис. … д-ра архитектуры / В.Е.Быков. – М., 1973 // Планета диссертаций [Электронный ресурс]. – 2006–2007. – Режим доступа: http: //planetadisser.com/see/dis_173309.html. – Дата доступа: 20.12.2007. – С. 3.

7. *Ванслов, В.В.* Опера и ее сценическое воплощение / В.Ванслов. – М.: Всерос. театр. об-во, 1963. – 255 с.

8. *Гісторыя* беларускага тэатра: у 3 т. / АН БССР, ІМЭіФ. – Мн.: Навука і тэхніка, 1983. – Т. 1. Беларускі тэатр ад вытокаў да Кастрычніка 1917 г. – 496 с.

9. *Громов, Н.Н.* Основные модели сценического пространства спектакля (лестничные и арочные конструкции) / Н.Н.Громов // Пространство и время в искусстве: межвуз. сб. науч. трудов / Ленингр. гос. ин-т театра, музыки и кинематографии; редкол.: О.И.Притыкина [и др.]. – Л., 1988. – С. 151 – 168.

10. *Пави, П.* Словарь театра: пер. с франц. / П.Пави. – М.: Прогресс, 1991. – 504 с.

11. *Сарбевский, М.К.* О совершенной поэзии, или Вергилий и Гомер / М.К.Сарбевский; пер. с польск. М.Плеза; Ин-т им. Оссолинских. – Вроцлав: Изд-во Польской академии наук, 1954. – 46 с.

12. *Сыркина, Ф.Я.* Русское театрально-декорационное искусство / Ф.Я.Сыркина, Е.М.Костина. – М.: Искусство, 1978. – 246 с.: ил.

13. *Шеповалов, В.М.* Динамика спектакля и теория сценографии / В.М.Шеповалов // Сценический портал [Электронный ресурс]. – 2004. – Режим доступа: http://www.stageportal.com/articles23/szenograf/ publication 42/. – Дата доступа: 20.08.2007.

14. *Шеповалов, В.М.* Сценография в художественной целостности спектакля: автореф. дис. … канд. искусствоведения: 17.00.01 / В.М.Шеповалов. – Л., 1986 // Сценический портал [Электронный ресурс]. – 2004. – Режим доступа: http: // www. stageportal. Com / articles 23 / szenograf / publication 43 /. – Дата доступа: 15.06.2007.

15. *Miller, A.* Teatr polski i muzyka na Litwie jako strażnice kultury zachodu (1745–1865) / A.Miller. – Wilno: Studjum zdziejów kultury polskiej, 1936. – 225 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ